www.nv-online.info – электронны дадатак да друкаванай версіі газеты «Народная Воля».

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№ 73 (4325)

14 верасня 2018 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

МИНСК–ТАШКЕНТ

«Это говорит о том, что мы, два государства и два народа, соскучились друг по другу»

«Народная Воля» поинтересовалась некоторыми деталями визита Александра Лукашенко в Узбекистан.



Готовились два года

Как выяснилось, официальный визит Лукашенко в Узбекистан готовился два года.

Два года назад во время встречи в Самарканде Шавкат Мирзиёев пригласил главу белорусского государства посетить Узбекистан через два месяца. «*Был бы жив Ислам* (первый президент Узбекистана Ислам Каримов), *это был бы больше протокольный визит*, – цитирует Лукашенко belta.by. – *Я попросил: «Давай возьмем паузу и подготовим солидный визит, чтобы была какая-то основа. Шевельнем наши двусторонние отношения, подстегнем нашу межправкомиссию. Когда мы увидим почти выстраданную дорожную карту, – встретимся. Мы приехали сюда с конкретными предложениями»*.

Впечатляющий кортеж

На видео пресс-службы президента Узбекистана видно, что А.Лукашенко передвигался по Ташкенту с кортежем около 20 автомобилей, отмечает gazetaby.com. И это помимо многочисленных мотоциклистов из сопровождения. Для удобства их передвижения улицы перекрыли.

Обменялись книгами

Президент Узбекистана Шавкат Мирзиёев вручил А.Лукашенко первый экземпляр сборника стихов Якуба Коласа, переведенных на узбекский язык.

Книга в Узбекистане была выпущена совсем недавно.

По словам Мирзиёева, Якуба Коласа в Узбекистане очень любят. Кстати, в Ташкенте есть памятник Коласу. И в ближайшее время планируется назвать одну из улиц в честь белорусского поэта, который в военные годы жил в Узбекистане. «Он очень много писал об узбеках, – сказал Мирзиёев. – В те тяжелые годы он был в Узбекистане с семьей, жил здесь и знает характер узбеков, то трудолюбие, похожее на белорусское. К его многим произведениям в Узбекистане относятся с любовью».

Лукашенко подарил Мирзиёеву книгу «Беларусь и мусульманский мир».

Договорились о строительстве завода

Беларусь готова построить в Узбекистане заводы по модернизации военной техники.

«Мы договорились, что не только отремонтируем, модернизируем вашу технику, летательные аппараты, бронетехнику, но и здесь, на вашей базе, можем создавать соответствующие заводы и модернизировать и Су, и МиГ, и БТР, и танки – в этом регионе море этой техники», – цитирует belta.by А.Лукашенко.

Вместе – в Афганистан

«Мы очень заинтересованы, чтобы узбекские братья помогли нам сотрудничать с Афганистаном. Но мы не хотим идти туда одни, хотим с вами туда прийти с нашей продукцией. Они это оценят, им все нужно», – сказал Лукашенко. И добавил, что афганский рынок не нуждается в суперкомбайнах или навороченных тракторах, им нужна простая техника. «Мы готовы сегодня в Узбекистане собрать такую технику, а завтра потихоньку ее реализовать – не только в Узбекистане, но и в Таджикистане, Афганистане».

Удачные контракты

На сайте Министерства внешней торговли Узбекистана сообщается: участники узбекско-белорусского форума делового и межрегионального сотрудничества подписали 82 экспортно-импортных контракта на общую сумму 193,3 млн долларов, а также достигли договоренностей о реализации инвестиционных проектов на общую сумму 38 млн долларов.

Президент Узбекистана отметил, что товарооборот между странами по итогам 2017 года значительно увеличился. Рост продолжается и в нынешнем году. «Это говорит о том, что мы, два государства и два народа, соскучились друг по другу», – добавил он. По его мнению, товарооборот между странами в перспективе может достигнуть 1 млрд долларов.

Алина ВЕТРОВА.

ІНІЦЫЯТЫВА

Выхадны на Дзяды замест 7 лістапада

У Гродне актывісты пачалі збор подпісаў пад зваротам да Аляксандра Лукашэнкі за тое, каб ён унёс змены ва *ўказ ад 26.03.1998 №157 "Аб дзяржаўных святах і святочных днях у Рэспубліцы Беларусь", з тым каб зрабіць непрацоўным днём рэлігійны святочны дзень 2 лістапада (Дзень памяці) замест 7 лістапада (Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі).*

Адным з асноўных аргументаў, якія змешчаны ў звароце да Лукашэнкі ад гродзенскіх актывістаў, гэта тое, што адзначэнне падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі на дзяржаўным узроўні супярэчыць артыкулу 2 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь: "Чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы".

ЗВЕЗДНЫЕ ГОСТИ

Владимир КОВАЛЕНОК: «Родная земля притягивает как магнит…»



На днях Крупский район посетили космонавты Владимир Коваленок, Александр Иванченков и Мирослав Гермашевский. Визит состоялся в рамках XXXI Международного конгресса Ассоциации участников космических полетов, который проходит в эти дни в Минске.

Коваленок сам представил своих коллег землякам: «*Дважды Герой Советского Союза Александр Сергеевич Иванченков. В 1978 году мы с ним провели в космосе 140 суток на борту орбитальной станции «Салют-6». На то время это был самый продолжительный космический полет.*

Герой Советского Союза, первый и единственный польский космонавт Мирослав Гермашевский. Мы тоже вместе работали на орбите, в качестве космонавта-исследователя прилетал к нам с Александром Сергеевичем на недельку».

В деревне Белое звездную делегацию встречали по старинной традиции хлебом-солью и красивой белорусской народной песней.

«Родная земля всегда притягивает к себе как магнит, – поделился своими чувствами Владимир Васильевич в доме, где родился. – *Это Родина, тут все: детство, юность. Я стараюсь как можно чаще бывать на родине, считаю, что это необходимо каждому человеку».*

В саду все угощались яблоками.

«В 1949 году посажена эта яблоня, – вспоминал Владимир Коваленок. – *Яблоки самые вкусные, потому что родные…»*

НА ЗАМЕТКУ

Сколько и чего будут возмещать налогоплательщики государству?

Постановлением Совета министров и Национального банка Республики Беларусь от 11 сентября этого года №658/12 решено, что к 2020 году граждане Беларуси будут погашать:

– 100% жилищно-коммунальных услуг (до конца текущего года мы будем возмещать 76,3% их стоимости);

– 80% стоимости проезда на городском транспорте, в том числе в областях – не менее 90%, в Минске – не менее 70%, и на пригородном автомобильном транспорте – не менее 65%;

– 100 % стоимости услуг связи, в том числе обычной и электронной.



ТОЧКА ЗРЕНИЯ

Александр ФЕДУТА

Жемчуг слез

Портал WWW.TUT.BY опубликовал результат проведенного специалистами авторитетнейшей Всемирной социологической службы Гэллап исследования Global Emotions 2018. Социологи измеряли степень проявления эмоций жителями различных стран: кто и как проявляет свое позитивное и негативное отношение к происходящему. Если судить по приведенным данным, мы, белорусы, удивительно неэмоциональный народ. И радость, и боль прячем в себе, сдерживая их проявления.

Социологам я привык доверять, но в данном случае их результаты расходятся с тем, что я вижу и чувствую повседневно. 12 сентября, например, мы с женой пошли в театр. Приехал на два дня на театральный фестиваль Московский художественный театр имени Чехова – тот, которым руководил когда-то Олег Ефремов, а совсем недавно – Олег Табаков. Привезли спектакль по рассказам выдающегося сибирского писателя-фронтовика Виктора Астафьева "Пролетный гусь". Актеры все больше молодые, лица которых мы знаем по телесериалам, но фамилию припомнить тяжело. Аскетичные декорации, минимум ухищрений в костюмах, грима почти нет.

Два акта. В первом зал плакал. Во втором – смеялся. Искренне, без надрыва, по-доброму. И ведь разные люди были в зале: и профессора университетов, и бывшие члены правительства (действующие явно предпочитают цирк), и, судя по всему, простые рабочие, учителя, несколько военных (судя по выправке). Все мы, оказывается, на боль и на радость реагировать можем и реагируем легко, потому что слезы эти точно очищают нас самих от невысказанного, от того, что тяготит нас, заботит. Живет в нас и боль прошедшей войны (Второй мировой), и ужас войн нынешних, и желание посмеяться всласть, увидев на сцене то, на что в быту не обращаем внимания, но что от этого не становится менее забавным и радующим.

Помню, как бабтя Катя объясняла мне, взрослому уже шестилетнему мужчине, что плакать – вовсе не стыдно:

– Ты плачь, детка, плачь! Слезки – это как жемчужинки. Поплачешь – легче станет.

Я не знал, что такое эти «перлинки», о которых она говорила. Но легче действительно становилось.

Волосы у бабти были черными и седыми одновременно. Поседела она в одну ночь. Муж пропал в первые дни немецкой оккупации (война для Гродно началась раньше, в 1939 году еще, но в семье не любили об этом говорить). Бабтя осталась с пятью детьми, из которых моя мама была старшей. И как-то раз немецкий патруль задержал ее, приняв из-за черных волос за цыганку. Ночь просидела она в караулке, пока не приехал бургомистр, хорошо ее знавший. Он и уговорил немцев ее отпустить.

Бабтя дошла до дома, стоявшего на берегу Немана, напротив старой гродненской лесопилки, постучала в окно. Моя мама, как старшая, посмотрела в окно – и не открыла. Она увидела изможденную женщину с седыми волосами.

Потом мама рассказывала мне – когда бабти уже не было в живых – что спрашивала ее, было ли ей страшно. Бабтя отвечала, что было, но она не плакала. Наверное, потому и советовала мне:

– Поплачь – легче станет.

Эмоции бывают разными. И поводов для эмоций у нас много. Один за другим уходят из жизни люди, с которыми нас что-то связывало, которые были нам дороги; мы спорили с ними, вместе радовались удачам, что-то обсуждали. Сужается круг друзей. Кто-то и вовсе теряет близких. Читаешь известия из белорусской армии – и ужас (тоже ведь эмоция) охватывает тебя: один за другим сводят счеты с жизнью солдаты – в мирное-то время, когда не нужно жертвовать собой, защищая Родину, народ, семью. Как в случае с солдатом Сашей Коржичем, дело которого продолжают рассматривать в суде: солдат покончил с собой, мать его осталась совсем одна и даже плакать не может – потому что боль такая, что слезы уже закончились.

А на суде выясняется, что сержанты не просто заставляли солдат покупать продовольствие для себя, но передавали купленное «наверх», офицерам. И я почему-то верю сержантам. Не о вафлях и печенье, конечно, речь.

А знакомый сказал мне о том, что главный «воспитатель» Министерства обороны Беларуси генерал Александр Гура, тихо ушедший на пенсию, по-прежнему работает в министерстве. Ценный сотрудник, он хорошо поставил воспитательную работу в белорусской армии – и куда же теперь без Александра Николаевича? Что же он будет делать без работы – плакать, что ли? Или картошку копать? Вот, продолжает воспитывать.

И говорят, что после «разноса в Орше» экс-министр промышленности Вовк попал в больницу. Не выдержал стресса. Не заплачешь ведь от бессилия и злости перед несправедливыми обвинениями главы государства, а защищать свою честь публично наши чиновники не привыкли. Нет давно среди них людей, способных хлопнуть дверью и уйти с гордо поднятой головой. Почему?

Не знаю. Нет у меня ответа на эти вопросы. И вот от безответности и безысходности, от какого-то замкнутого круга, в котором проходит жизнь белоруса, может быть, и закончился у нас как у народа запас тех «перлинок», о которых говорила мне бабтя Катя, вырастившая после потери мужа пятерых детей, не получившая за это ни правительственных наград, ни даже пенсии приличной, потому что какая же пенсия была у санитарки в городской больнице?

Боль есть. Слез нет. Держимся.

ВІНШУЕМ!

Леаніду Левановічу – 80!

«Пісьменнік усім дае работу – і акцёрам, і рэжысёрам, і кіношнікам, і мастакам. Янка Купала напісаў верш «Спадчына», музыку да яго стварыў Ігар Лучанок, «Песняры» праспявалі – і пайшла ў народ песня. Іван Мележ напісаў раман «Людзі на балоце», Купалаўскі тэатр паставіў па ім спектакль, рэжысёр Віктар Тураў зняў мастацкі фільм, БТ зрабіла тэлесерыял... Так што Пегас хоць і спатыкаецца, але цягне ўвесь воз культуры. На жаль, улады не разумеюць, што хлеб і першаасnова любога мастацтва – літаратура. У нас жа словы «пісьменнік» і «літаратура» пераставі ўжывацца, засталіся толькі «дзеячы культуры і мастацтва». Неяк Калядным вечарам я глядзеў цырымонію ўручэння прэміі «За духоўнае адраджэнне». Намінантаў было чалавек 20, і – ніводнага пісьменніка! Ніводнага! Толькі і чуваць папрокі, што беларускія пісьменнікі ніяк не напішуць «Войну и мир». Але ў нашай літаратуры ўжо ёсць такі маштабны твор. Вазьміце дзесяць ваенных аповесцяў Васіля Быкава – вось вам «Война и мир». Дарэчы, знакаміты амерыканскі славіст прафесар Джозэф Мозар, перакладчык на англійскую мову аповесці «Мёртвым не баліць», заначыў, што калі б яе пераклалі ў 1960-я гады, то свет ведаў бы нашага Быкава больш, чым Салжаніцына».

(Цалкам гутарку з пісьменнікам ***Леанідам ЛЕВАНОВІЧАМ****, якому сёння спаўняецца 80 гадоў, чытайце на 3-й стар.)*



Народная Воля http://www.nv-online.info
14 ВЕРАСНЯ 2018 г.

ЧУЛІ?

Лябедзька стварыў «Еўрапейскі дыялог»



«Народная Воля» даведалася, чым зараз жыве і чым займаецца былы старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька. На апошнім партыйным з'ездзе ён адкрыта заявіў пра тое, што больш не мае намеру вылучацца на пасаду старшыні. Яго месца заняў Васіль Палякоў, а Лябедзька адправіўся ў «вольнае плаванне». Пагаворвалі, што Лябедзька стварыць нейкую новую арганізацыю, якая будзе займацца пытаннямі сацыялогіі. Пра свае планы Анатоль Уладзіміравіч паабяцаў распавесці на пачатку восені, але пакуль ніякіх заяў не рабіў. Таму мы самі вырашылі пацікавіцца ў Лябедзькі, чым ён займаецца зараз.

– Чым займаюся? Кожны дзень раблю зарадку і еджу на ровары па сваіх справах, рэгулярна гуляю ў футбол – *адказаў Анатоль Уладзіміравіч*. – У задумах напісанне кнігі з рабочай назвай «Апошні парламент Беларусі». Я стаў разбіраць уласны архіў, бо быў сведкам працы Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання. Гэта, лічу, апошні легітымны парламент Беларусі. Кніга выйдзе, на мой погляд, звышактуальная. Яе задача паказаць беларусам, у тым ліку і тым, хто зараз пры ўладзе, што было страчана пасля гэтага. Мне падаецца, што ў многіх з нас няма асэнсавання, што ў нас скралі. Разагналі парламент, збілі дэпутатаў, гэта нібы не з намі, гэта нібы на іншай планеце…

Таму галоўная задача кнігі – звярнуцца да кожнага і падштурхнуць яго да спробы адказаць на пытанне «Што ў нас скралі?». Напярэдадні будучых парламенцкіх і прэзідэнцкіх кампаній такая кніга беларусам патрэбна.

– **Вы гаварылі, што ствараеце нейкую новую непалітычную арганізацыю…**

– Грамадская арганізацыя «Еўрапейскі дыялог» была зарэгістравана яшчэ на пачатку бягучага года. Я з'яўляюся яе кіраўніком.

– **Чым вы будзеце займацца ў межах новастворанага праекта?**

– Цэнтр «Еўрапейскі дыялог» будзе актыўна займацца некалькімі кірункамі дзейнасці. Адзін з іх – стварэнне эфектыўнай дыскусійнай пляцоўкі, на якой абмяркоўваюцца актуальныя для Беларусі і яе грамадзян пытанні – эканамічныя, палітычныя, пытанні бяспекі. У планах на наступны год правядзенне трох такіх міжнародных дыскусій якраз-такі па пытаннях эканомікі і расійска-беларускіх адносін. Плануецца, што ўдзел у працы дыскусій возьмуць міжнародныя эксперты. Будзем запрашаць для працы і прадстаўнікоў улады. Але ці ўвойдуць яны ў гэтыя адчыненыя дзверы – іх справа.

– **З'едуцца ў Мінск эксперты, пагавораць і паедуць дахаты. Далей што? Які сэнс дзейнасці, які ён вынік? І да таго ж ёсць «Мінскі дыялог», які працуе па той самай схеме, якую прапануеце вы…**

– На «Мінскім дыялогу», на мой погляд, не ўздымаюцца пытанні, нязручныя для ўлады, не ўсе зацікаўленыя эксперты могуць там выказацца. Таму я і вырашыў займацца «Еўрапейскім дыялогам».

Што тычыцца канкрэтных вынікаў нашай працы, то вы павінны разумець: «Еўрапейскі дыялог» – гэта не сходка Дзядоў Маразоў, якія нешта зробяць за ўладу ці за саміх беларусаў. На сённяшні дзень «беларускае пытанне» амаль знікла з міжнароднага, еўрапейскага парадку дня. Мы малацікавыя еўрапейцам – ім не да нас, у іх свае пытанні. Якім чынам можна вырашыць гэтую праблему? Толькі з дапамогай правядзення прадстаўнічых мерапрыемстваў, на якія прыязджаюць людзі, што нешта вырашаюць у сваіх краінах. Эксперты, парламентарыі, чыноўнікі.

Яшчэ адзін накірунак нашай дзейнасці палягае ў наступным: мы будзем даводзіць да грамадзян, да ўлады, што вопыт рэформ, якія былі праведзены ў іншых краінах, – паспяховы, ён даў плён. І нам не трэба вынаходзіць ровар. Далёка хадзіць не трэба, той жа вопыт самакіравання ў Польшчы ці Літве даў плён.

Магчыма, «Еўрапейскі дыялог» будзе праводзіць рэгіянальныя школы, дзе будзем вучыць людзей бараніць сябе ад націску дзяржавы. Карацей, планаў шмат…

– **Анатоль Уладзіміравіч, хто стаіць побач з вамі ў «Еўрапейскім дыялогу»?**

– Вы павінны разумець, што ў гэтай некамерцыйнай грамадскай арганізацыі няма пасад, як, напрыклад, у партыі. Сталай, фіксаванай каманды няма. Пры правядзенні мерапрыемстваў «Еўрапейскі дыялог» будзе абапірацца на экспертаў у той ці іншай галіне.

– **Ці варта чакаць прэзентацыі арганізацыі?**

– Канкрэтныя справы – самая лепшая прэзентацыя.

– **За якія сродкі будзе існаваць «Еўрапейскі дыялог»?**

– Разліковы рахунак адкрыты зусім нядаўна, тыя, хто жадае ахвяраваць на будучыню, – калі ласка!

Віталь ГАРБУЗАЎ.

СТОП-КАДР

А дзе па-беларуску?



Надпіс побач з Гродзенскім абласным драмтэатрам з'явіўся напярэдадні святкавання юбілею горада.

У выхадныя Гродна адзначае чарговы юбілей – 890 гадоў з часу першай згадкі аб горадзе ў летапісах. З гэтай нагоды побач з будынкам гродзенскага драмтэатра з'явіўся надпіс вялікімі літарамі – «Гродно 890 лет». Маўляў, для турыстаў, каб фатаграфаваліся. А насупраць, над уваходам у рыма-каталіцкі касцёл бернардзінцаў, надпіс па-польску – «400-lecia konsekracyi kościoła». А гэты надпіс, відаць, для вернікаў.

Не стае вялікай расцяжкі дзе-небудзь на вуліцы Савецкай па-кітайску, бо мы ж апошнім часам наладжваем добрыя стасункі з КНР, да нас адтуль прыязджаюць турысты і бізнесмены. Хаця ўсё ж ёсць час, магчыма, і з'явіцца.

Што тычыцца надпісаў на беларускай мове, то такіх заўважных ды яшчэ ў цэнтры горада няма. Затое жыхарам і гасцям горада прапануецца забаўляльная праграма аж на два выхадныя дні.

Міхал КАРНЕВІЧ.

19 гадоў без Анатоля Красоўскага і Віктара Ганчара

16 верасня 1999 года зніклі былы віцэ-прэм'ер Беларусі Віктар Ганчар і бізнесмен Анатоль Красоўскі. З тых часоў пра іх лёс нічога не вядома. Кропка ў крымінальнай справе аб іх знікненні не пастаўлена да гэтага дня.

У той дзень Ганчар і Красоўскі сустракаліся ў лазні на вуліцы Фабрычнай у Мінску. Паводле сведчанняў жыхароў бліжэйшых дамоў, прыкладна ў 22.35 яны былі выкрадзены групай асоб і вывезены ў невядомым накірунку…



16 верасня ў галандскім Эйндховене пройдзе адзінаццатая штогадовая цырымонія ўшанавання памяці гвалтоўна зніклых беларусаў. Цырымонія адбудзецца ў жывога мемарыяла «Чатыры дрэвы». Чатыры дрэвы былі пасаджаны 16 верасня 2008 года пры ўдзеле гарадскіх улад Эйндховена – тады яшчэ горада-пабраціма Мінска – у памяць Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага, Дзмітрыя Завадскага.

Распачне цырымонію дачка Анатоля Красоўскага Валерыя.

Мерапрыемства арганізавана «Міжнародный амністыяй», Федэрацыяй нідэрландскіх прафсаюзаў і грамадзянскай ініцыятывай «Мы памятаем».

Марына ВІШНЕЎСКАЯ.

Долар больш не будзе даражэць?

Учора курс долара абваліўся на 0,0153 рубля да **2,15**28 рубля за долар і спыніў свой 12-дзённы рост, падчас якога амерыканская валюта падаражэла на 11 капеек.

Курс еўра таксама знізіўся на 0,0119 рубля да **2,50**09 рубля за еўра. А вось расійскі рубель умацаваўся.

"Нельга казаць, што рост долара спыніўся і далей беларускі рубель будзе толькі ўмацоўвацца, – кажа старшы аналітык кампаніі "Альпары" **Вадзім Іосуб**. – *Ужо на наступных таргах сітуацыя можа кардынальным чынам змяніцца. На падставе нейкіх аднадзённых валютных ваганняў немагчыма зрабіць ніякага прагнозу, хаця далейшае зніжэнне курса долара верагодна. І верагоднасць гэтага павялічвае той факт, што ў Расіі долар трэці дзень зніжаецца да расійскага рубля. Абсалютна лагічна, што і беларускі рубель пачаў умацоўвацца".*

Фінансавы спецыяліст лічыць, што да канца года найбольш верагодна, што долар з-за санкцый працягне рост у Расіі, а значыць, і ў Беларусі.

"Але нельга сказаць, на колькі працэнтаў можа абясцэніцца беларускі рубель, – дадае наш суразмоўца. – *Усё будзе залежаць ад таго, якія санкцыі Захад прыме ў дачыненні да Расіі".*

Алесь СІВЫ.

КАДРЫ

«Очень сожалеем, что Валентину Степановну от нас забирают»

Что говорят о новых руководителях «Белфармации» и «Белмедтехники» на прежнем месте их работы?

На этой неделе Александр Лукашенко дал согласие на назначение ряда руководителей в системе здравоохранения. Уже не вакантны должности гендиректоров РУП «Белфармация» и УП «Белмедтехника», также назначен заместитель министра здравоохранения, который отвечает за обеспечение отрасли медицинским оборудованием, проще говоря, за закупки товаров медицинского назначения, а также курирует вопросы лицензирования медицинской и фармацевтической деятельности.

Кто эти новые руководители, которые вступают в должности в непростой момент? Их предшественники – бывший замминистра **Игорь Лосицкий**, экс-гендиректор «Белфармации» **Вячеслав Гнитий** и экс-гендиректор «Белмедтехники» **Александр Шарак** – главные фигуранты громкого дела о коррупции в медицине. Более того, они до сих пор не отпущены на свободу, хотя многим фигурантам «дела медиков» изменена мера пресечения на подписку о невыезде.

На первый взгляд все фамилии назначенцев – малоизвестные. Но это только для широкой общественности. Так, например, вся трудовая деятельность нового руководителя торгово-производственного госпредприятия «Белфармация» **Валентины Игнатенко** связана с фармацией. После окончания фармацевтического факультета Витебского мединститута она работала в аптеке города Каменец Брестской области (Игнатенко оттуда родом), потом, в 1987 году, переехала в Могилев. Была заместителем заведующего аптекой №8 города Могилева, затем работала в аппарате управления Могилевского отделения «Белфармации», с 2010 года – в должности гендиректора. В 2011 году Валентина Игнатенко закончила Академию управления при президенте РБ.

Новая должность почти подарок ко дню рождения – 23 сентября Валентине Игнатенко исполняется 54 года.

«Валентина Степановна очень грамотный, очень толковый работник, – рассказали «Народной Воле» в могилевском отделении предприятия. – *Мы безумно сожалеем, что ее от нас забирают. Но рады ее успехам. Уверены, что она справится на новом участке работы. Хотя, конечно, при таком пристальном внимании к отрасли со стороны руководства страны ей, наверное, будет нелегко».*

Николай Куденьчук, который возглавил УП «Белмедтехника», ранее на протяжении 10 лет занимал пост заместителя начальника управления здравоохранения Гомельского облисполкома. Он курировал вопросы закупки медтехники, в его подчинении находилась планово-экономическая служба управления. В Гомельском облисполкоме говорят, что это назначение стало неожиданностью не только для коллег Николая Куденьчука, но и для него самого. *«Две недели назад он узнал о новом назначении*, – рассказали нам в облисполкоме. – *Как отреагировал? Это лучше у него спросить. Внешне был спокоен…»*

Ну и наконец заместителем министра здравоохранения стал **Борис Андросюк**, у которого есть и опыт работы в Минздраве, и опыт руководителя. Последнее место работы Андросюка – главврач известного санатория «Белоруссия» в крымском поселке Мисхор. Эта здравница входит в структуру компании «ЦентрКурорт» Управления делами президента. Борису Андросюку 50 лет.

К СЛОВУ

РНПЦ травматологии и ортопедии возглавил 44-летний доктор наук



*Вчера коллективу Республиканского научно-практического центра травматологии и ортопедии представили нового директора – **Михаила Герасименко**.*

Бывший руководитель РНПЦ – академик **Александр Белецкий**, один из фигурантов «дела врачей», – до сих пор находится в СИЗО КГБ.

До недавнего времени Михаил Герасименко возглавлял Белорусскую академию постдипломного образования, ректором которой был с октября 2014 года. В ноябре Михаилу Герасименко исполнится 45 лет. Несмотря на столь молодой возраст, он многое успел: защитил две диссертации – кандидатскую и докторскую, с 2009-го по 2012 год работал заместителем главврача 6-й Городской клинической больницы Минска, с 2012-го по 2014 год – заведующим кафедрой травматологии и ортопедии Белорусского государственного медицинского университета.

Михаил Герасименко, можно сказать, ученик академика Александра Белецкого. В 2012 году Белецкий был научным консультантом докторской диссертации Герасименко *«Диагностика и лечение повреждений и заболеваний коленного сустава у детей и пациентов молодого возраста»*.

Еще один факт из биографии нового директора РНПЦ травматологии и ортопедии. В прошлом году Михаил Герасименко был в списке претендентов на звание члена-корреспондента Академии наук по специальности «хирургия», однако на Общем собрании Академии наук большинством голосов по этой специальности членом-корреспондентом был избран заместитель директора по научной работе РНПЦ неврологии и нейрохирургии **Юрий Шанько**.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

100 РАДКОЎ

Міхася СКОБЛЫ



Як касманаўты ўздымалі прэстыж беларускай мовы

Падчас нядаўняга адкрыцця мінскага Міжнароднага касмічнага кангрэсу расійскі касманаўт Алег Арцем'еў наўпрост з арбітальнай станцыі нечакана прывітаў дэлегатаў па-беларуску. Аказалася, бацька ягоны з Друі, жонка з Баранавічаў, таму і мова яму не чужая. Відэаролік хтосьці выклаў у сеціва, ён сабраў шмат спадабаек і каментарыяў, сэнс якіх зводзіўся да таго, што нарэшце ў касмічнай прасторы ўпершыню прагучала беларускае слова. Маўляў, касманаўт нагадаў, што любоў да радзімы – гэта ў першую чаргу любоў да роднага слова.

Так, любоў да радзімы – пачуццё сур'ёзнае, і тут я «не скажу за ўсю Адэсу». Але сваю прыхільнасць да матчынай мовы двое беларускіх касманаўтаў – Пятро Клімук і Уладзімір Кавалёнак – усё ж засведчылі. Можна нават сказаць, што менавіта яны ўзнялі прэстыж беларускай мовы на касмічную вышыню.

Помніцца, як Кавалёнак у 1978 годзе чытаў у космасе вершы з кнігі «Нача» Васіля Зуёнка. І калі ягоны напарнік – карэнны русак Аляксандр Іванчэнкаў – чагосьці не зразумеў, беларус з ходу пераклаў няўцямныя радкі на рускую мову. Заўважу: усё гэта адбывалася ў жывым тэлеэфіры.

Як жа трапіла кніга «Нача» на арбітальную станцыю? Пасля першага няўдалага палёту ў 1977 годзе (не адбылася запланаваная стыкоўка) Уладзімір Кавалёнак прыехаў на радзіму, у родную вёску Белае, што на Крупшчыне. Прыехаў адзін, без суправаджальных картэжаў. Неяк зайшоў у мясцовую кнігарню і купіў на памяць кнігу пад знаёмай назвай (у ваколіцах Белага цякла рэчка Нача). Не паспеў дачытаць яе ў Зорным гарадку – надарыўся другі, больш працяглы, палёт. І калі з Зямлі спыталіся, што прыслаць на арбіту касмічнай поштай, папрасіў «Начу». І неўзабаве карабель-грузавік «Прагрэс» даставіў кнігу на станцыю «Салют-6».

А зваротная пошта прынесла аўтару «Начы» паштоўку з удзячным надпісам па-беларуску: «Васілю Зуёнку з борта касмічнага комплексу са шчырай падзякай за вершы на роднай мове. 4.07.78 Уладзімір Кавалёнак».

Больш за пяць месяцаў працягваўся той палёт, ажно Рыгор Барадулін пажартаваў у дасціпнай эпіграме: «*В.Зуёнак рыфму чуў з пялёнак. / І зямляк Зуёнкаў Кавалёнак / лётаў доўга ў космасе, няйначай, / захапіўся Васілёвай «Начай»*.

Не будзе лішнім нагадаць і факт з больш блізкай гісторыі – менавіта дэпутату Уладзіміру Кавалёнку выпаў гонар у 1991 годзе ўнесці ў залу Вярхоўнага Савета 12-га склікання толькі што зацверджаны ў якасці дзяржаўнага бел-чырвона-белы сцяг.

Дзе цяпер знаходзіцца касмічны асобнік «Начы» – невядома. А вось у Гудзевіцкім літаратурна-краязнаўчым музеі ўвагу наведвальнікаў нязменна прыцягвае кніга Ларысы Геніюш «Невадам з Нёмана» з дарчым надпісам касманаўта Пятра Клімука, які таксама «ўздымаў» беларускую паэзію ў касмічныя вышыні. Тая кніга адыграла ў лёсе музея немалаважную ролю.

Створаны настаўнікам мясцовай школы Алесем Белакозам Гудзевіцкі музей ад пачатку выклікаў нараканні мастоўскіх і гродзенскіх чыноўнікаў – за «нацыяналістычныя ўхілы». Але заснавальнік музея аказаўся не з палахлівых і ў піку начальству размясціў у адным з музейных пакояў экспазіцыю, прысвечаную Ларысе Геніюш. Што выглядала натуральным – у Гудзевіцкай школе паэтка вучылася, на мясцовых могілках пахаваны яе дзед.

Але на дварэ быў 1973 год, і ініцыятыва Белакоза была кваліфікавана ўладай як антысавецкая дыверсія ў савецкай школе.

У Гудзевічы тэрмінова прыехала адмысловая камісія і вырашыла ўсё і ўсіх зняць: Белакоза – з працы, а Геніюш – з экспазіцыі. Адміністрацыя школы паступіла больш мудра: няхай непакорлівы настаўнік спачатку перапрацуе экспазіцыю, а потым піша заяву на звальненне. Белакозу нічога не заставалася, як пагадзіцца. На перапрацоўку далі два тыдні.

І так сталася, што акурат у тыя дні вярнуўся з арбіты Пятро Клімук – у арэоле заслужанай славы. Да героя-земляка і вырашыў звярнуцца па дапамогу Алесь Белакоз. За ноч ягоная жонка Вера выткала гальштук з беларускім арнаментам і імянным надпісам. Алесь Мікалаевіч да каштоўнага падарунка далучыў кнігу «Невадам з Нёмана» і тэрміновай поштай адправіў усё ў Зорны гарадок.

Праз два тыдні расчулены касманаўт прыслаў падзячны ліст, абяцаў прыехаць у Гудзевічы, а на дасланай кнізе напісаў: «Вучням Гудзевіцкай школы з пажаданнем любіць радзіму і шанаваць родную мову. 11.09.73. П.Клімук».

Кніга, вярнуўшыся з Зорнага гарадка, адразу набыла статус найкаштоўнейшага экспаната і ўпрыгожыла сабою тую самую экспазіцыю, якая выклікала гнеў начальства. У Гудзевічы панаехала карэспандэнтаў, прымчалася здымачная група абласнога тэлебачання. Мастоўская райгазета «Зара над Нёманам» на першай паласе дала сенсацыйны матэрыял «Падарунак касманаўта», з якога вынікала, што кніга Ларысы Геніюш пабывала ў космасе...

Ці трэба казаць, што пасля такога павароту падзей недатыкальнымі зрабіліся і экспазіцыя, і ўвесь музей, і ягоны стваральнік. Ніхто з чыноўнікаў ужо нават і не заікаўся пра ягоную дыверсію. Наадварот, на педагагічных нарадах Алеся Белакоза хвалілі за новыя метады пазашкольнага выхавання. І калегі-настаўнікі зайздросна ўздыхалі: «Ну і Белакоз – ужо і ў космас дабраўся!»

Калі Ларыса Геніюш дачулася, якую ахоўную грамату займеў Гудзевіцкі музей, яна прысвяціла касманаўту прачулыя радкі: «*Дзякуй, што наш ты з палескае вёскі, / Слаўна ўзляцеў і шчасліва вярнуўся. / Дзякуй, што ў сэрцы адданым, сыноўскім, / Насіў ты і носіш імя Беларусі...*»

На жаль, Алег Арцем'еў аказаўся адзіным беларускамоўным выступоўцам на мінскім касмічным кангрэсе. Звыклыя да прэзідыумаў генерал-палкоўнікі і двойчы Героі Савецкага Саюза Пятро Клімук і Уладзімір Кавалёнак «імя Беларусі ў адданых сыноўскіх сэрцах», як выглядае, прыхавалі дзесьці глыбока-глыбока…

«Народная Воля» в Facebook
www.facebook.com/nv.online.info
в VKontakte www.vk.com/nvonlineinfo

Народная Воля
http://www.nv-online.info
14 ВЕРАСНЯ 2018 г.

АСОБА

Леанід ЛЕВАНОВІЧ:

«У Савецкім Саюзе не было сексу, а ў незалежнай Беларусі знік… аргазм»

*Вёска Пятрылава на Вілейшчыне – проста райскі куток. Лес кругом, паветра гаючае, птушкі спяваюць. Нешматлікія хаты атулены садамі і вінаграднай лазой. А цішыня – як у космасе. Умовы для творчасці – лепшых не трэба. Яшчэ чвэрць стагоддзя таму гэта зразумеў пісьменнік **Леанід Левановіч**, які пакінуў тлумную сталіцу і стаў паўнапраўным вяскоўцам. У вёсцы ён адзначае і сваё 80-годдзе, перад якім у творцы пабываў карэспандэнт «Народнай Волі».*

– Леанід Кірэевіч, як вы, нараджэнец Магілёўшчыны, апынуліся тут, на Вілейшчыне?

– Вёска наша сапраўды як у вяночку – з усіх бакоў лес. Прыехаў я сюды 30 гадоў таму з адной мэтай – купіць тут хату і перавезці на Лысую Гару, дзе былі пісьменніцкія лецішчы. Нагледзеў адну, а гаспадыня кажа: «Ну добра, купіш ты ў мяне хату, а каму застануцца хлявы, студня і склеп? Купляй усё і жыві тут». А вакол так чаборам пахла! І мне падумалася: дай я куплю гэты чабаровы хутар. Вельмі мне захацелася тут застацца. Спачатку я ездзіў у Пятрылава як на лецішча, а з 1992 года жыву тут стала. Даглядаю пчол, невялічкую гаспадарку і пішу свае раманы.

– А з жыўнасці што трымаеце?

– Раней разводзіў трусоў, цяпер засталіся толькі куры і пчолы. Пчолы – маё даўняе захапленне. Да пчалярства мяне прывучылі цешча і цесць. Яны жылі тут непадалёк на хутары, каля рэчкі Канатопка, на стыку Вілейскага і Маладзечанскага раёнаў. Я неяк быў у горадзе, а тут у суседкі вылецеў пчаліны рой, і жонка яго купіла. Гэта было ў 1987 годзе. З таго часу і «ўліп» я ў гэту справу. Аднойчы, калі ў часопісе «Нёман» я пад сваім сапраўдным імем-прозвішчам надрукаваў вялікі нарыс «Белорусский мед», галоўнаму рэдактару Андрэю Макаёнку патэлефанаваў нейкі чытач і пацікавіўся: «А калі гэта Леанід Лявонаў прыязджаў з Масквы? Так здорава напісаў пра беларускі мёд!» А Леанід Лявонаў, аўтар рамана «Русский лес», тады грымеў на ўвесь Савецкі Саюз. І Андрэй Ягоравіч параіў мне: «Шукай, братка, псеўданім, бо твае ганарары будуць памылкова ў Маскву пасылаць». Доўга я шукаў той псеўданім. І вось аднойчы ў доме творчасці «Каралішчавічы» апынуўся за адным сталом з Іванам Мележам. І ён з такой спачувальнай усмешкай кажа: «Але ж і дагадзілі вам бацькі з імем-прозвішчам – Леанід Лявонаў. Мая вам парада – падпісвайцеся Левановіч. Паслухаўся я Івана Паўлавіча. І так ужо прывык, што калі клічуць Лявонавым, то я нават не рэагую.

– Смак вашага мёду ведае палова Саюза беларускіх пісьменнікаў. Адзін мой знаёмы пчаляр прызнаўся, што ягоныя пчолы вельмі любяць, калі ён з імі па-беларуску размаўляе, песні на роднай мове ім спявае. А пчолы яму потым смачным мёдам аддзячваюць. А ў вас ёсць нейкі своеасаблівы падыход да вашых пчол?

– Дык і мае беларускую мову любяць! Вось жа мы хадзілі каля вулляў, фатаграфаваліся, размаўлялі. І – ніводная не ўджаліла. Пчалінае жыццё хавае нямала таямніц. Скажам, калі пчала адчувае свой блізкі скон, то стараецца сама выпаўзці з вулля. Каб не абцяжарваць сваіх супляменніц. Яе ж давядзецца выносіць, а гэта ў цеснаце вулля зрабіць няпроста. Летнія рабочыя пчолы жывуць усяго 35–40 дзён. Шмат працуюць, таму крылы зношваюцца. А без крылаў пчала не жыве. Зношваюцца менавіта крылы – не сэрца ці іншыя органы. А зімовыя пчолы жывуць 8–9 месяцаў. Вось якая несправядлівасць. Летнія наносяць мёду і паміраюць, а есці яго будуць тыя, якія зімуюць. Усё для таго, каб сям'я далей жыла і працягвала свой род.


З сабакам Баксам.

– А колькі жыве пчаліная матка?

– О, яна жыве, як каралева: у яе світа, яе даглядаюць. Можа жыць 4–5 гадоў. За лета яна адкладвае каля 2000 яечак. У моцным раі 30 ці нават 40 тысяч пчол. А вялікія, моцныя сем'і налічваюць да 80 тысяч. Цяпер у мяне ўсяго чатыры сям'і, але моцныя – мёду далі болей, чым раней 10 сем'яў давалі.

– Ёсць мёд ліпавы, ёсць верасовы, ёсць грэчкавы. А якія мёдадайныя расліны пашыраны ў вашых ваколіцах?

– Услухайцеся, якія словы мілагучныя: *мёдадайныя, мёдадаі.* Я іх упершыню вычытаў у Зоські Верас, якая спецыялізаваны пчалярскі часопіс «Беларуская Борць» у міжваеннай Вільні выдавала. У нас тут увесну першым арэшнік распускаецца. Яшчэ снег ляжыць, а арэшнік ужо свае «султаны» развешвае, пчолы пылок пачынаюць збіраць. А потым пайшлі вярба, дзьмухаўцы, маліна, каліна...

– А ці ладзіце вы тут з суседзямі? Не бывае канфліктаў з-за пчол?

– Не бывае. З суседзямі мы жывём дружна. На маіх днях нараджэння ўся вёска гуляла. Як гаварыла суседка-нябожчыца баба Юля: «Свой за гарой, а сусед у акне». Я ўзімку кожны дзень да яе заходзіў. Яшчэ ў парозе чуў яе голас: «Дзякуй, што адчыняеце мае дзверы». Восем дзяцей выгадавала, а жыла адна. На жаль, цяпер у Пятрылаве ўсяго шэсць хат з людзьмі засталося.

– Бачу на вашым стале свежы нумар «Народнай Волі». А як часта ў Пятрылава пошта прыходзіць?

– Паштальёнка з Карпавічаў на матацыкле за 5 кіламетраў двойчы на тыдзень прыязджае – у сераду і суботу. А раней на кані ездзіла. У яе нейкая старасвецкая карэта была, я называў яе каралевай Зінай. Узімку паспрабуй праз гурбы прабіцца… Але – заўсёды даязджала. Апрача «Народнай Волі» я пяць выданняў выпісваю – «Звязду», «Новы Час», «Дзеяслоў», «Беларускі пчаляр», раёнку «Шлях Перамогі».


У добрага гаспадара і пчолы жывуць у палацах.

– Ведаю, што ў некаторых краінах пчалярства падтрымліваецца дзяржавай. А ў Беларусі?

– Дзяржава нашых пчаляроў падтрымлівае слаба. А ім трэба плаціць – за апыленне. Бо, калі не стане пчол, грэчкі і рапсу ўвогуле не будзе. І ў лесе нічога не вырасце без апылення. Таму ва ўсім свеце пчалярам і даплачваюць – за апыленне садоў, агародаў, палеткаў. І яшчэ: калі пасевы апрацоўваюць хімікатамі, то пчаляроў загадзя папярэджваюць, каб не выпускалі пчол. У нас нічога гэтага, на жаль, не робіцца.

– У СССР пісьменнікі лічыліся «прысцяжнымі рамянямі партыі», «інжынерамі чалавечых душ»… А ў незалежнай Беларусі ў пісьменніка які статус?

– Дык ён і павінен быць інжынерам чалавечых душ. Толькі тады ён нечага варты. Прывяду вам такі прыклад. Калі выйшла мая кніга «Мадонна з кветкаю», я падарыў яе акадэміку Гаўрылу Гарэцкаму. І вось сядзім мы ў саўне, за 100 градусаў тэмпература, і Гаўрыла Іванавіч мне гаворыць: «З цікавасцю прачытаў вашу кніжку, але на вашым пісьме адчуваецца газетны ўплыў. Пішыце болей пра душу, пра тое, чым чалавек жыве, пра што думае, апісвайце яго перажыванні – цікавей будзе чытацца».

– А жыхары Пятрылава прачыталі ўсе вашы кнігі?

– Навошта ўсе, тым больш іх ажно два дзясяткі? Але чытаюць і мясцовыя. Калі я часам пад'язджаў аўтобусам, то гучна, на ўвесь салон, прасіў: «Праз сто метраў будзе прыпынак Пятрылава, спыніце, калі ласка!» І аднойчы вадзіцель усміхнуўся: «Хачу мець кнігу з аўтографам». Наступным разам я падпісаў яму кніжку «Ларыса, або Каханне аўтамабіліста». Чарговым разам еду, а вадзіцель: «Прачытаў вашу кніжку двойчы. Спадабалася капітальна. Дзякуй!» Цяпер жа выходзяць кніжкі, і іх ніхто не заўважае, не рэцэнзуе. А ў 1979 годзе, калі выйшла мая кніжка «Якар надзеі», на яе з'явілася ажно 9 рэцэнзій! Свой водгук у «Чырвонай змене» надрукаваў Мікола Ермаловіч, будучы славуты гісторык. Сёння беларускай літаратуры цяжка, як ніколі. Яна занядбаная дзяржавай. Вы заўважылі, у нас словы «пісьменнік», «літаратура» перасталі ўжывацца, засталіся толькі «дзеячы культуры і мастацтва». Неяк Калядным вечарам я глядзеў цырымонію ўручэння прэміі «За духоўнае адраджэнне». Намінантаў было чалавек 20, і – ніводнага пісьменніка! Ніводнага!

– У Беларусі з 1995 года не прысвойваецца званне «Народны пісьменнік». Новыя народныя артысты і народныя мастакі з'яўляюцца, а пісьменнікі – не. Гэта ж таксама невыпадкова.

– Невыпадкова. Улады не разумеюць, што літаратура – гэта хлеб мастацтва. Вось глядзіце. Янка Купала напісаў верш «Спадчына». Да яго напісаў музыку Ігар Лучанок, «Песняры» праспявалі – і пайшла ў народ песня. Іван Мележ напісаў раман «Людзі на балоце». Купалаўскі тэатр паставіў па ім спектакль, рэжысёр Віктар Тураў зняў мастацкі фільм, БТ зрабіла тэлесерыял… Так што Пегас, хоць і спатыкаецца, цягне ўвесь воз культуры. Пісьменнік усім дае работу – і акцёрам, і рэжысёрам, і кіношнікам, і мастакам. Вось кажуць: беларускія пісьменнікі ніяк не напішуць «Войну и мир». Але ў нашай літаратуры ўжо ёсць такі маштабны твор. Вазьміце дзесяць ваенных аповесцяў Васіля Быкава – вось вам «Война и мир». Дарэчы, прафесар Джозэф Мозар, адзін з найлепшых славістаў ЗША, пераклаў на англійскую мову аповесць «Мёртвым не баліць» і зазначыў, што, калі б яе пераклалі ў 1960-я гады, свет ведаў бы Васіля Быкава больш, чым Салжаніцына. Дарэчы, Мозар і маю кніжку пераклаў, магу ганарыцца. У 2013-м «Жонка ліквідатара» («The Liquidator's wife») выйшла ў Нью-Ёрку.

– У Бостане выйшла і другая ваша кніга, на рускай мове, – «Оргазм в варшавском отеле». Назва прываблівая…

– Я спачатку не згаджаўся на такую назву – усё ж Бостан даволі пурытанскі горад. Але выдавец угаварыў. Праўда, апавяданне з такой назвай у мяне ёсць. У Беларусі яно не друкавалася. У нейкай другой маёй кніжцы слова «аргазм» паўсюль выкраслілі. Выходзіць, у СССР не было сексу, а ў незалежнай Беларусі знік… аргазм. А вось амерыканцы не пабаяліся даць у загаловак. На маю думку, беларускай літаратуры якраз не хапае эротыкі і гумару. У сваіх кнігах я заўсёды стараўся даваць два-тры анекдоты. Напрыклад, у рамане «Шчыглы» ёсць такі эпізод. 1945 год. Франтавікі вярнуліся дадому. Аруць. Селі перакурыць. І стары дзед расказвае, як Івану ў поле Мар'я прыносіць полудзень – яйка варанае, сала, гаршчок з крупеняй. Сеў Іван есці, а Мар'я села насупраць. А панталонаў тады не насілі, і ўся яе гаспадарка на віду... Есць Іван, паглядае, і раптам гаршчок у руках ягоных ажно закруціўся. І ён не стрымаўся: «Мар'я, схавай сваю хвеню, а то разалью крупеню!» Мне прыемна, што мая творчасць цікавіць і замежнага чытача. Скажам, летась маё эсэ «Ода хайвэю» было апублікавана ў амерыканскім часопісе «USA–Belarus. Observer» («ЗША–Беларусь. Агляд»). Ён рассылаецца па ўсіх беларускіх амбасадах у свеце. А рэдагуе часопіс ганаровы консул Беларусі ў ЗША Майкл Маргуліс.

– У ЗША жыве ваша дачка з сям'ёй. Вы хацелі б, каб яна вярнулася, каб вы маглі ўнукаў часцей бачыць?

– Дачка ў Амерыцы ўжо ўкаранілася, у яе там дом, праца, муж-праграміст. Мы з жонкай ездзілі да іх, тры зімы гадавалі ўнука. Я і Амерыку паспеў паглядзець, з беларусамі-эмігрантамі пазнаёміцца. Пад Нью-Ёркам, у гарадку Глен-Коў, наведаў пісьменніка Масея Сяднёва. Паміж нашымі вёскамі на Магілёўшчыне – усяго 7 кіламетраў. А я праляцеў 7 тысяч, каб з ім сустрэцца. Пасябравалі мы і з перакладчыкам Ігарам Казаком, сынам нашага выдатнага лірыка Рыгора Крушыны. Ігар аб'ездзіў 52 краіны, ён бліскучы перакладчык-сінхраніст, напісаў цікавую кніжку ўспамінаў, якая выйшла ў Мінску. А з Янкам Запруднікам мы праз дзень размаўлялі. Яму ўжо 93 гады, але ён усіх проста зараджае аптымізмам і кажа, што пражыве 110 гадоў.



З жонкай Рагнедай Леанід Кірэевіч разам ужо 53 гады.

– З жонкай Рагнедай вы пражылі ўжо больш за паўвека. А дзе пазнаёміліся?

– Так, мы ўжо 53 гады разам. Я яе сваёй княгіняй называю. А пазнаёміліся мы ў філармоніі на танцах у 1965 годзе. Сталі сустракацца, запрасіла яна мяне на знаёмства з бацькамі ў вёску Кліманты Маладзечанскага раёна. Помню, мяне ўразіла, як мае будучыя цесць і цешча спявалі пад гітару беларускія песні – «Дазволь цябе любіць» (на словы Змітрака Бядулі), «Аратаму» (верш Янкі Купалы). І сёння чую апошні куплет: «*Хай злыдні над намі скрыгочуць зубамі – / Любі сваю ніву, свой край / І, колькі ёсць сілы, да самай магілы / Ары, барануй, засявай!*» Пасля гэтага мне стала сорамна, што я не пішу па-беларуску. А мяне ад роднай мовы адвучылі Магілёўскае культасветвучылішча і служба на флоце. І пачаў я вучыць мову занава.

– У Пятрылава, можа, хто і часцей прыехаў бы, але ж дарога… Як казаў адзін дзед: «Падвязвай зубы». Ведаю, што вы шмат гадоў пераконваеце чыноўнікаў, каб пракласці да вёскі асфальт. Якія вынікі?

– Трэба ўсяго 7 кіламетраў таго асфальту! З абодвух бакоў ён блізка да Пятрылава падыходзіць. Мы і да кіраўніка аблвыканкама на прыём хадзілі, і 42 подпісы сабралі пад зваротам у Адміністрацыю прэзідэнта. А адтуль наш зварот спіхнулі ў той жа аблвыканкам, які паведаміў: «Асфальт проложить нецелесообразно». А да нашай дарогі прымыкаюць 10 вёсак! Чатыры ў Маладзечанскім раёне і шэсць у Вілейскім. Сёлета я патэлефанаваў на «Прамую лінію» старшыні аблсавета Наталлі Якубіцкай, дык яна не паверыла, што столькі вёсак. Ну і што? Пасля званка прыйшла мне адпіска за подпісам дырэктара прадпрыемства па праектаванні і будаўніцтве дарог Д.Сцяпанава. Маўляў, «з выездам на месца ўстаноўлена, што патрабуецца ад Радашковічаў да Карпавічаў заасфальтаваць 13 кіламетраў гравійкі». Гэта значыць, ніхто нікуды не выязджаў, бо гравійкі тае толькі 7 кіламетраў! І вось 30 гадоў дарога псуе людзям нервы. На выхадныя цэлыя караваны машын з Мінска і Маладзечна едуць у навакольныя вёскі. А дарога – як пральная дошка, у пенсіянераў сапраўды зубныя пратэзы вывальваюцца. Месяц таму еду праз Максімаўку і бачу: каля мемарыяльнага знака Сымона Рак-Міхайлоўскага стаяць людзі. Аказваецца, беларуская сям'я з Канады была ў Купалавай Вязынцы і заехала на радзіму Рак-Міхайлоўскага. Дарэчы, ён не толькі выдатны палітычны дзеяч, але і таленавіты кампазітар, аўтар музыкі знакамітай песні «Зорка Венера». Госці з Канады ніяк не маглі зразумець, чаму асфальт скончыўся перад вёскай. Мне было проста сорамна, я не знайшоўся, што адказаць.

– У вёсцы Бычкі на Ушаччыне мясцовыя жыхары дарогу, якую дапамог заасфальтаваць Васіль Быкаў, назвалі Васілёвай. Я жадаю вам настойлівасці і перамогі, каб і пятрылаўцы праз год-другі з гонарам казалі – Левановічава дарога!

– Дай Бог! Гэта было б вельмі здорава, я быў бы рады.

Антось БРЫЛЕЎСКІ.

ПРЯМАЯ ЛИНИЯ

Второе сердце мужчины



*В «Народной Воле» прошла очередная «Прямая линия» – на этот раз с урологом высшей категории, заведующей урологическим отделением медицинского центра «ЛОДЭ» **Ольгой Викторовной АНТОНОВОЙ.***

Как всегда, вопросов от читателей было так много, что ответы доктора мы вынуждены публиковать в двух номерах газеты. Сегодня речь пойдет о самых распространенных заболеваниях мужской мочеполовой сферы – простатите и аденоме предстательной железы.

Не опасно для жизни, но...

– Добрый день, Ольга Викторовна! Меня зовут Виктор Павлович, мне 72 года. Днем чувствую себя хорошо, а ночью беспокоит учащенное мочеиспускание. Может, надо какие лекарства попить?

